# З матчыным словам і песняю

*<u>Крыніца друкавання</u>*: Пяткевіч, А. З матчыным словам і песняю / Аляксей Пяткевіч // Гродзенская праўда. – 1996. – 18 чэрв. – С. 3.

Даўно ведаю і шаную гэтага чалавека. Усё свае свядомае жыццё ён ішоў цярнютаю дарогаю праўды і справядлі васц, стараючыся зацвердзіць нацыянальныя каштоўнасці беларускага народу, яго права на самастойны лес, на развіццё сваёй духоўнай культуры. Мяняліся дзяржаўныя парадкі, палітычныя рэжымы, ўлады, ён жа заставаўся паслядоўным і непахісным у сваёй вернасці роднаму, у нястомным служэнні нацыянальнаму мастацтву, найперш песеннай музыцы. І сёння, не зважаючы на ідэалагічныя зігзагі нашага нялёгкага жыцця А. Шыдлоўскі — гарачы абаронца і прапагандыст мовы свайго народу, яго нацыянальнай школы, яго песні.



Ён з той кагорты заходнебеларускіх энтылігентаў – Рыгор Шырма, Генадзь Цітовіч, Антон Валынчык, віктар Роўда, – якія прайшлі суровую загартоўку жыццем і выраслі як буйныя музычныя веды, что заўседы хіліцца да народных творчых традыцый, да урокаў спадчыны.

А. Шыдлоўкі за свой век надта многа зрабіў на духоуна-патрыятычнай ніве, але нямала і перажыў балючага і светлага. Аглядаючыся ў далячынь, бачыць ён перш за ўсё родную вёску Мінкі, што на Смаргоншчыне. Тут прайшло дзяцінства ў беднай, мнагадзетнай сялянскай сям'і Адсюль у час першай сусветнай вайны выязджалі ў бежанства, у Расію. Вярнуліся ў 1921 годзе ў дашчэнту разбураныя, спаленыя мясціны. Доўгі час туліліся у зямлянцы, зведалі голад. Але тут, у бацькоўскім кутку, рана асвятліла душу

родная песня, якая чулася, здавалася, паўсюль. Тут пад уплывам масавага руху Беларускай сялянска-рабочай грамады, да якой належалі і бацька, і шмат хто з аднавяскоўцаў, фарміравалася грамадская свядомасць, пачуццё нацыянальнай годнасці, якое прывяло у Віленскую беларускую гімназію (1927 г.). Праз два няпоўныя гады за ўдзел у вызваленчым руху быў выключаны і апынуўся за турэмнымі кратамі. Затым пад канвоем паліцыі адвезены да бацькоў. Працягваў вучобу ужо ў Клецкай беларускай гімназіі, ды неўзабаве выключаны і адсюль. Зноў былі арышт, турэмная камера, выхад пад нагляд паліцыі. Але моцна клікала да сябе Вільня – цэнтр рэвалюцыйна-вызваленчага і культурнага жыцця Заходняй Беларусі. А. Шыдлоўскі пачынае працаваць ў сакратарыяце вядомага пасольскага клуба "Змаганне", выконвае розныя падпольныя даручэнні КПЗБ. У 1931 г. быў арыштаваны на нелегальнай кватэры на Браслаўшчыне і ў выні ку суда атрымаў пяць гадоў турмы. Пайшлі чаргавацца астрогі ў розных гарадах Польшчы.

Выйшаў на волю ў 1936 г. і працаваў у службе каналізацыі ў Вільні. Пасля пераехаў у Варшаву, дзе лягчэй было знайся заробак. Давялося мяняць заняткі – на вугальным складзе, у псіхіятрычнай бальніцы, на будоўлі. Актыўна удзельнічаў у рабоце "Асветнага таварыства беларусаў у Варшаве".

У 1937 г. яшчэ раз трапіў у турму. Усе гэтыя гады жыла ў душы родная беларуская песня. Яна дадавала сіл, мацавала дух у цяжкія часіны. У часы вучобы прастілася на жыццёвы прастор, калі юны гімназіст адкрываў для сябе хараство мастацкага слова, калі сам складаў вершы, публікуючы іх у вучнёўскіх часопісах. Яна ўздымала настрой і грэла сэрцы зняволеных, калі яны абменьваліся любімымі песнямі Але і песня прыгнечанага народу зведвала уціск ва ўмовах санацыйнага рэжыму.

У 1940 г. А. Шыдпоўскі стаў артыстам хору Беларускага ансамбля песні і танца. Пачалася новая паласа жыцця у прафесійным мастацкім калектыве, якая цешыла і абяцала вялікя перспектывы. У маі 1941 г. ансамбль выехаў у Маскву, дзе паспяхова выступаў на розных канцэртных сцэнах. Падчас вайны абслугоуваў франтавікоў, працаваў на Урале, у Сібіры, у Сярэдняй Азіі. Затым калектыў перабіраецца на тэрыторыю Беларусі, ў 1944 г. - ў Гродна. З гэтай пары жыццёвы і творчы лёс А. Шыдлоўскага непарыўна звязаны з горадам над Нёманам. Праца ў ансамблі (з 1950 г. - Дзяржаўны хор БССР) пад кіраўніцтвам такога майстра, як Р.

Шырма, была выдатнай творчай школай і, вядома, спрыяла пошуку новага, кампазітарскага прызвання.

У 1951 г. А. Шыдлоускі скончыў завочна гістарычны факультэт Маскоўскага універсітэта і пачаў працаваць настаўнікам у Гродна.

Адмачасова ён кіруе самадзейнымі хорамі, для якіх хацелася знайсці адметны рэпертуар, што адпавядаў бы свайму адчуванню свету. Так сталі нараджацца ўласныя песні, да якіх сам пісаў паэтычныя тэксты. Поспех прыйшоў досыць хутка – творы А.Шыдлоўскага падхапілі ў розных харавых калектывах, яны сталі гучаць па радыё.

На працягу 60-80-х гадоў кампазітар-песеннік працуе вельмі плённа. Складваецца яго ідывідуальная творчая манера, з'яуляюцца песні, якія становяцца сапраўды ўсенароднымі. Хто не ведае, напрыклад, мілагучны "Гродзенскі вальс” ("Між зялёных дуброў светлы Нёман плыве…" пранікнёна-спавядальную "Колькі ў небе зор", па-народнаму гуллівую і акварэльна-лірычную "Чараўніцу", велічальна-урачыстую "Ой, зайграйце, музыкі!". Своеасаблівасць стылю А.Шыдлоўскага найперш - у прыхільнасці да беларускіх народна-песенных традыцый. Творы яго эмацыянальна адкрытыя, распеўныя па інтанацыі, сардэчныя па характеру лірызму. У іх шчодра выяўляюцца святло і ласка, маральная чысціня народнай душы. Не выпадкова яны папулярныя сярод людзей розных узростаў і прафессій і трывала ўвайшлі ў рэпертуар прафессійных і аматарскіх хораў. Лепшыя з песень А.Шыдлоўскага склалі яго зборнікі “Песні” (1964), “Ляці, наша песня” (1990), выдадзенныя ў Мінску.

Заслужаны дзеяч культуры Беларусі, ен шмат сіл і творчай энергіі аддаў развіццю культуры харавых спеваў, выхаванню чулых адносін да тутэйшых пеўшых традыцый. Аляксандр Канстанцінавіч заўседы быў пераканаты, што спадчына народу наша вялікае багацце, якое трэба берагчы, разам з тым кожны музычны калектыў павінен мець непаўторнае творчае аблічча. Працуючы ў Гродна дырэктарам Дома народнай творчасці, затым загадчыкам музычнага сектара навукова-метадычнага Цэнтра народнай творчасці і культасветработы, А.Шыдлоускі нястомна дзейнічаў як аргані затар і кансультант шматлікіх харавых калектываў вобласці. І тое, што музычная выканальная творчасць на Гродзеншчыне захавала і ўмацавала лепшыя мясцовыя традыцыі, што ўзгадавалася тут цэлая плеяда творцаў і пастаноўшчыкаў беларускай песні, цікавых інтэрпрэтатараў музычнага фальклору, сталася не без чуйнага удзелу старэйшыны нашай нацыянальнай

культуры.

З ім цікава гутарыць пра ўсё, ён шмат ведае. Штож датычыць народнай песні ўвогуле народнай музыкі, то тут А.Шыдлоўскі надоўга захопіць вас, і не тольки фактамі пра песеннае жыццё нашага краю, а асабліва любоўю і адданасцю самаму дарагому, чаму прысвяцу жыццё.

Добра, што ён ёсць у нас такі. І добра, што мы разумеем яго, што мы з ім.